**Стральчонак** Галіна Генадзеўна // Памяць. Докшыцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. А. В. Скараход ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская энцыклапедыя, 2004. — С. 648.

## СТРАЛЬЧОНАК ГАЛІНА ГЕНАДЗЕЎНА

Нарадзілася 18.5.1962 г. ў г. п. Бягомль. Маці памерла, калі Галіне было 15 гадоў. Яе выхоўвала бабуля Настасся Сямёнаўна. Пасля сканчэння ў 1977 г. васьмі класаў Макаўскай сярэдняй школы Галіна вучылася ў Мінскім медыцынскім вучылішчы. Працавала па спецыяльнасці ў в. Уручча пад Мінскам. Вырашыла звязаць свой лёс з Савецкай Арміяй, стала прапаршчыкам медыцынскай службы. Служыла ў Афганістане. Была замужам. 29.12.1986 г. Г. Г. Стральчонак загінула, калі выносіла параненых байцоў з поля бою. Пахавана ў в. Халмоўка Барысаўскага раёна Мінскай вобласці, па месцы жыхарства бацькі. Пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі.